# БЯЗЬ МІТУ НЯМА НАЦЫІ

## *Пасьляслоўе аўтара*

Калі разважаеш, чаму суседзі беларусаў, а ў нядаўнім мінулым «сябры па няшчасьці» — палякі, літоўцы, латышы, чэхі — так шпарка крочаць шляхам будаўніцтва ўласных дэмакратычных дзяржаваў поплеч зь іншымі народамі, прыходзіш да высновы: не згубіўшы сваёй мовы, культуры, гісторыі, гэтыя народы маглі ідэнтыфікаваць сябе як нацыі, быць пэўнымі ва ўласных сілах. Вось і разарвалі путы каляніяльнай залежнасьці й зажылі сваім розумам.

Я заўсёды зайздросьціў палякам, якія міталягізавалі падзеі сваёй гісторыі й нават сваіх літаратурных герояў. Нават той іранічны вершык, у якім дзіця называе сябе маленькім палякам, а сваім гербам — белага арла, ёсьць нацыянальным мітам, які зь дзяцінства яднае палякаў. Кожная сфармаваная нацыя мае свой нацыянальны міт, і няма нацыі без уласнага міту. Зьяднаць грамадзянаў краіны нельга ні паводле спажывецкай ідэі «шкваркі й чаркі», ні паводле, хай нават вонкава й прывабных, але чужых мітаў, ні паводле лжывых замшэлых тэорыяў панславізму ці заходнерусізму. Менавіта гэта прапаноўвалася беларусам два апошнія стагодзьдзі й прапаноўваецца сёньня. Гэта — шлях на ўзбочыну ад эўрапейскай цывілізацыі. А калісь беларуская дзяржава з тысячагадовай гісторыяй і багатай, але згубленай ці скрадзенай, культурай займала ў Эўропе пачэснае месца.

Адшукаць, вярнуць, абжыць сваю спадчыну — такую задачу пасьля вяртаньня незалежнасьці ў 1990-х гадах паставілі сабе многія людзі навукі й культуры Беларусі. Такую ж мэту меў і сумесны праект часопісу «Спадчына» й Радыё Свабода — праграма «Неабжытая спадчына». Вынікам яе стала разуменьне, што культурныя,





гістарычныя, сьветаглядныя плашчыны краіны Беларусь — сапраўдная Атлянтыда, якая зьнікла ў віры трагічных падзеяў мінулага тысячагодзьдзя, затанула ў водах чужых культураў. І ў новае тысячагодзьдзе перадача, памяняўшы фармат, увайшла пад назовам «Беларуская Атлянтыда».

На шуканьне беларускай Атлянтыды выправілася вялікая група аднадумцаў — гісторыкаў, філёзафаў, культуролягаў, мастацтвазнаўцаў, фальклярыстаў, пісьменьнікаў. Гэта людзі, якія адмовіліся надалей несьці цяжар догмаў савецкай ці русафільскай навукі, або ніколі імі не былі абцяжараныя. Практычна кожная перадача дарыла ці навуковае адкрыцьцё, ці сьвежы, нечаканы позірк на праблемы й зьявы нацыянальнай гісторыі й культуры. Знайшоўшы адзін скарб, мы бачылі пэрспэктывы адкрыцьця новага. І так, здаецца, можа быць датуль, пакуль агульнымі высілкамі беларусы ня знойдуць сваю Атлянтыду — свой уласны Нацыянальны Міт.

У кнігу ўвайшлі сцэнары выбраных перадачаў, якія прагучалі ў этэры ў 2000—2005 гадах. Аб'ём і кампазыцыя выданьня не дазволілі надрукаваць тэксты яшчэ каля сотні перадачаў, створаных за пяць гадоў. Яны ня ёсьць горшымі, проста трэба было рабіць выбар. Шэраг фрагмэнтаў старажытных прававых дакумэнтаў і мэмуарнай літаратуры падаюцца ў адаптаваным варыянце. Адаптацыя, а таксама фальклёрныя запісы зробленыя ўдзельнікамі перадачаў.

*Вячаслаў Ракіцкі*